# ТАЙНА ЗА СЯМЮ ПЯЧАТКАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Многіх, безумоўна, цікавіць, а ці можна падкарэктаваць вынікі асобных удзельнікаў тэсціравання на этапе праверкі іх работ? Гэта мы і вырашылі высветліць у арганізатараў ЦТ.

Дарэчы, дастаўкай матэрыялаў цэнтралізаванага тэсціравання ўжо не першы год займаецца фельд'егерская служба, якой давяраюць дыпламатычную перапіску і дзяржаўныя сакрэты. Яны дастаўляюцца ў апламбаваных сумках накшталт інкасатарскіх. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў працуе камісія, у функцыі якой уваходзіць пералічыць усе дастаўленыя пакеты, і, так бы мовіць, іх легалізаваць. Мяркуеце, што гэта простая работа? Дарэмна, паколькі на масавых дысцыплінах ЦТ задзейнічана больш за тысячу экзаменацыйных аўдыторый... Далей пакеты па ланцужку перадаюцца ў іншы пакой, дзе распячатваюцца (без прысутнасці пабочных асоб), і гэты факт фіксуецца ў журналах, якія ляжаць побач з кожным сканерам. Увогуле ўсе офісныя і тэхнічныя памяшканні ў інстытуце забяспечаны магутнай сістэмай відэаназірання, якая дазваляе назапашваць вялізны аб'ём відэаінфармацыі, і калі ўзнікне патрэба, можна заўсёды паглядзець, што адбывалася ў тым ці іншым памяшканні ў пэўны дзень у прысутнасці работнікаў інстытута і пасля таго, як яны яго пакінулі.

## Адкуль бяруцца дзесяць дзён?

Для скапіравання бланкаў выкарыстоўваюцца шэсць высакахуткасных сканераў, якія дазваляюць за суткі апрацаваць 50 тысяч асобнікаў. Гэтай хуткасці дастаткова для таго, каб забяспечыць наступны этап работы — верыфікацыю, якая адымае значна больш часу. Прычым, скануюцца ў абавязковым парадку як запоўненыя, так і незапоўненыя, але пагашаныя бланкі, а таксама бланкі абітурыентаў, якія былі адхіленыя ад удзелу ў ЦТ. Гэта робіцца, каб перакнацца, што ні адзін бланк не застаўся за сценамі інстытута, хоць выкарыстаць яго ў зламысніцкай усё адно не атрымалася б, паколькі ўсе бланкі маюць скразную нумарацыю. І для работнікаў інстытута не праблема прасачыць, у якім пункце тэсціравання і ў якой аўдыторыі знаходзіўся той ці іншы бланк.


У такіх сейфах захоўваюцца рабочыя матэрыялы, якія яшчэ не сталі тэставымі заданнямі. Па сейфе на кожны прадмет. Доступ да сейфа мае толькі адзін чалавек — метадыст.

Папяровыя бланкі адказаў захоўваюцца да 31 снежня бягучага года, а электронныя вывявы — 75 гадоў. Далей работа ідзе толькі з электроннымі вывямі.

Не ўсе разумеюць, чаму вынікаў тэсціравання даводзіцца чакаць да дзесяці дзён. Як высвятляецца, працэс праверкі работ стрымлівае верыфікацыя, якая ажыццяўляецца выключна ў інтарэсах абітурыентаў. Праблема ў тым, што сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтную якасць пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат (асабліва калі чорнае чарніла ў гелевай ручцы мае серабрыстае адценне). Таму задача верыфікатараў — прасачыць за правільнасцю распазнавання сімвалаў на бланках. Скажам, камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за лічбу «8», ці лічбу «1» за лічбу «7», калі яна напісана неакуратна. Чалавек гэта бачыць і папярэджвае магчымую памылку.

Арганізатары ЦТ канстатуюць, што акуратнасцю абітурыенты, на жаль, не вылучаюцца, а многія і ўвогуле замест друкаваных літар выкарыстоўваюць прапісныя. Ці, напрыклад, камп'ютар можа няправільна «прачытаць» прозвішча абітурыента, таму і сертыфікат будзе выпісаны затым з памылкай у прозвішчы ці ў пашпартных звестках. Прыкладна кожны дваццаты абітурыент дапускае ў вобласці рэгістрацыі хоць бы адну памылку. Некаторыя ўмудраюцца дапусціць памылкі ў вобласці рэгістрацыі ва ўсіх трох тэставых работах. А ёсць абітурыенты, якія ўвогуле забываюць з-за хвалявання запоўніць у бланку вобласць рэгістрацыі. Поўная колькасць абітурыентаў здаюць абсалютна чысты бланк адказаў, прычым і на «чарнавіку» не назіраецца «слядоў» інтэлектуальнай работы.

## Курцы не дапускаюцца

Усяго на верыфікацыі задзейнічаны каля 300 чалавек, пераважна студэнткі (паколькі дзяўчаты больш падыходзяць для манатоннай работы) і маладыя педагогі. Верыфікацыя патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі, таму рабочая змена доўжыцца чатыры гадзіны. З 9 гадзін раніцы да 21 гадзіны за камп'ютарнай тэхнікай змяняюцца тры змены. Дарэчы, для студэнтаў гэта добры спосаб падзарабіць. Але да прэтэндэнтаў ёсць ад асноўныя патрабаванні — яны не павінны курыць (інстытут — зона, свабодная ад курэння) і не могуць удзельнічаць у гэтым годзе ў цэнтралізаваным тэсціраванні. З няўважлівымі верыфікатарамі дагавор могуць скасаваць — гэта не тое месца, дзе можна працаваць нядбайна.

«А ці могуць апаратары ўмяшацца ў працэс праверкі тэставых заданняў?» — цікавімся мы ў арганізатараў ЦТ.

«Ні ў якім разе! Людзі, што сядзяць на верыфікацыі, толькі дапамагаюць у распазнаванні рукапісных сімвалаў, — тлумачаць у інстытуце. — Камп'ютар выдзяляе чырвоным кожны знак, які выклікае ў яго пытанні, і задача верыфікатара — падказаць яму правільны. Ім дазваляецца ўносіць толькі такога роду праўкі, а свае знакі яны ўнесці не могуць, бо праграмнае забеспячэнне запамінае любое зробленае імі выпраўленне. Кожны верыфікатар працуе пад сваім паролем. Прычым верыфікацыя праводзіцца не менш як тры разы рознымі людзьмі, і фактычна адзін кантралюе другога. А ў сховішчы ёсць яшчэ і папяровы бланк адказаў, які можна ў спрэчнай сітуацыі зверыць з электроннай вывявай».

І яшчэ адзін важны момант: верыфікатары не бачаць заданняў і не ведаюць правільных адказаў. Ключ з эталоннымі адказамі з'яўляецца ў самы апошні момант, усе заданні «ўзважваюцца» (ацэньваецца ўзровень іх складанасці для абітурыентаў у залежнасці ад колькасці тых, хто з імі справіўся) і толькі тады выстаўляюцца балы.

## А раптам пашанцуе?

Некаторых абітурыентаў і педагогаў цікавіць, чаму час, адведзены на тэсціраванне па розных прадметах, вагаецца ад 90 да 180 хвілін?


Для дастаўкі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма ўскрыць непрыкметна. Як толькі цэласнасць стужкі парушаецца, на ёй праступаюць схаваныя ад вачэй сімвалы.

— Тое, што працягласць тэставага часу складае 90, 120, 150 і 180 хвілін па розных групах прадметаў, а колькасць заданняў у тэстах вагаецца ад 30 (па фізіцы і матэматыцы) да 60 (па замежнай мове), з'яўляецца вынікам праведзенай намі апрабацыі гэтых паказчыкаў падчас рэпетыцыйнага і пробнага тэсціравання, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — Дарэчы, гэтыя паказчыкі амаль цалкам суадносяцца з такімі ж параметрамі ў абсалютнай большасці краін, дзе праводзяцца іспыты ў тэставай форме. Так, напрыклад, тэарэтычныя і практычныя назіранні сведчаць, што адведзены на выкананне тэста час не павінен



Дастаўкай матэрыялаў ЦТ займаецца фельд'егерская служба, якой давяраюць дыпламатычную перапіску і дзяржаўныя сакрэты. Яны дастаўляюцца ў апламбаваных сумках накшталт інкасатарскіх.

перавышаць тры гадзіны, інакш абітурыенты стамляюцца, што не дазваляе ім якасна выканаць заданні. Ды і вынікі нашага маніторынгу часу, які абітурыенты трацяць на тэсціраванне, сведчаць, што па фізіцы і матэматыцы толькі асобныя абітурыенты працуюць у аўдыторыі ўсе тры гадзіны. Павелічэнне часу можа пры пэўных умовах прывесці да стамлення абітурыентаў, што, у сваю чаргу, адаб'ецца на выніках тэсціравання. Да таго ж празмерна доўгі час можа прывесці і да з'яўлення вялікай колькасці абітурыентаў з аднолькава высокімі баламі, а зусім кароткі час — правакаваць на ўгадванне правільных адказаў.

Дарэчы, тая акалічнасць, што пэўная частка абітурыентаў пачынае пакідаць экзаменацыйныя аўдыторыі ўжо ў першыя 30 хвілін пасля старту тэсціравання, нікольki арганізатараў ЦТ не здзіўляе. «Гэта форма ўступных іспытаў вельмі дэмакратычная, даступная і зручная, таму яна і прыцягвае выпадковых людзей. Абітурыент пазбаўлены асабістага кантакту з экзаменатарам, перад якім было б сорамна распісацца ў сваім невуцтве, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Мікалай Фяськоў. — А вось зайсці ў экзаменацыйную аўдыторыю, зазірнуць у тэст, выбраць некалькі, як ім падаецца, правільных адказаў, не праблема. А раптам з мінімальным балам пашанцуе прайсці хоць на якую-небудзь спецыяльнасць? Такія думкі, на жаль, таксама ў маладзёжным асяроддзі прысутнічаюць».

Мікалай Фяськоў паабяцаў, што да заканчэння тэрмінаў прыёму дакументаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы ў продажы з'явяцца зборнікі тэстаў па ўсіх прадметах з «ключамі» (адказамі на кожнае заданне тэстаў да ўсіх 10 варыянтаў). Адпаведна кожны ўдзельнік тэсціравання зможа самастойна або з педагогам прааналізаваць свае памылкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*
**Фота прадастаўлены Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў.**

■ А па руках!

# ЗА СПІСВАННЕ НА ЭКЗАМЕНЕ — ПАЗБАЎЛЕННЕ ВОЛІ

**Пасля распаду Савецкага Саюза ўсе рэспублікі пачалі ўкараняць незалежныя працэдуры экзаменаў. Прычына — непразрыстая сістэма ўступных іспытаў у ВНУ. Праўда, для таго, каб забяспечыць інфармацыйную бяспеку, кожная краіна распрацоўвае свае падыходы...**

Так, у Арменіі тыраж і падрыхтоўка экзаменацыйных матэрыялаў ажыццяўляюцца за межамі краіны. Захоўванне экзаменацыйных матэрыялаў адбываецца пры падтрымцы банкаўскай сістэмы краіны. Усе іспыты праводзяцца ва ўмовах аснашчэння кожнага экзаменацыйнага цэнтра тэхнічнымі сродкамі глушэння сувязі і відэаназірання. Ход правядзення экзаменаў у аўдыторыях шырока асвятляецца з дапамогай анлайн-трансляцый у агульнадаступных месцах.

Пры правядзенні нацыянальнага тэсціравання ў Казахстане, якое спалучае выпускную атэстацыю выпускнікоў з уступнымі экзаменамі ва ўстановы больш высокай ступені навучання, захоўванне і дастаўка экзаменацыйных матэрыялаў ажыццяўляюцца пад кантролем Камітэта нацыянальнай бяспекі. Асаблівасцю правядзення адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет у Казахстане і Азербайджане з'яўляецца здача інтэграванага тэста адразу па чатырох-пяці дысцыплінах.

У Азербайджане адбор у ВНУ праводзіцца па чатырох групах спецыяльнасцяў. Яны адрозніваюцца наборам экзаменацыйных прадметаў. Скажам, пры паступленні на гуманітарныя, педагагічныя спецыяльнасці, музыку і мастацтва абітурыенты здаюць родную мову, літаратуру, матэматыку, гісторыю і замежную мову. Увогуле матэматыку здаюць усе абітурыенты, незалежна ад выбару будучай прафесіі. Гэта зроблена для таго, каб сфарміраваць у вучняў сур'ёзнае стаўленне да ўсіх школьных дысцыплін, а не толькі да прадметаў, якія маюць непасрэднае дачыненне да будучай прафесіі...

Вельмі сур'ёзна ставяцца да агульнадзяржаўнага экзамену — «гакаа» — у Кітаі. Традыцыйна экзамен праводзіцца ва ўсіх кітайскіх школах у адзін час. Школьнікам дазваляецца ўзяць з сабой толькі ручку, аловак, гумку, лінейку і цыркуль. Нават пітную ваду ў бутэльках праносіць не дазваляецца. У экзаменацыйных памяшканнях знаходзяцца дэтэктары, камеры і глушыльнікі мабільных сігналаў. За экзаменамі не могуць назіраць настаўнікі, якія вучылі гэтых дзяцей — іх замяняюць староннія людзі. Іспыты займаюць два дні. Раніцай першага 2,5 гадзіны адводзіцца на адказы на пытанні па літаратуры і кітайскай мове, а пасля абеду — па замежнай мове і матэматыцы. У другі дзень здаецца яшчэ адзін з абавязковых прадметаў, а таксама адзін з прадметаў на выбар, які залежыць ад выбранай вучнем ВНУ. Вынікі розлічвае камп'ютарная праграма — гэта робіцца для выключэння чалавечага фактару. Агульнадзяржаўны экзамен лічыцца надзвычай сур'ёзным, паколькі вызначае ўсё далейшае жыццё чалавека. Праваліў пры яго здачы гарантуе працу на нізкіх пасадах і незадаволенасць сям'і. За спісванне абітурыент можа атрымаць нават турэмны тэрмін.



А выпускнікі ў Францыі напрыклад, больш за ўсё баяцца экзамену на ступень бакалаўра. Гэта нешта накшталт расійскага ЕГЭ. Паспяховая здача «бака», як называюць яго французы, забяспечвае гарантаванае паступленне ва ўсе ўніверсітэты краіны. Гэта значыць, што студэнту застанецца толькі напісаць заяву ў ВНУ аб жаданні вучыцца. Вышэйшыя навучальныя ўстановы Францыі павінны браць усіх ахвотных, аднак у самых прэстыжных універсітэтах усё ж такі ёсць негалосны адбор па выніках «бака».

Для паступлення ў ВНУ Ізраіля вучні здаюць псіхаметрычны экзамен, вынікі якога лічацца сапраўднымі яшчэ 7 гадоў! Прымаць у ім удзел можна колькі заўгодна раз, але паміж спробамі яго здаць павінна прайсці не менш за паўгода. Экзамен уяўляе сабой тэсты па трох кірунках: вербальнае мысленне, колькаснае мысленне (ацэньваюцца матэматычныя здольнасці) і англійская мова. На пытанні прапануюцца чатыры варыянты адказаў. Практыка паказала, што псіхаметрычны экзамен апраўдаў сябе: у большасці выпадкаў абітурыенты, якія атрымалі высокую ацэнку, дасягаюць лепшых поспехаў у вучобе, чым тыя, хто атрымаў нізкую ацэнку. Аднак такі тып экзамену часта падвяргаецца крытыцы. Ёсць меркаванне, што ён дыскрымінуе людзей з пэўным тыпам мыслення, адрозным ад тыпу мыслення складальнікаў экзамену.

А вось і зусім «свежая» навіна з экзаменацыйнага фронту: **улады Алжыра былі вымушаны часова заблакіраваць доступ да сацыяльных сетак па ўсёй краіне, каб не даць магчымасць карыстацца падказкамі на іспытах у сярэдніх школах**. Амаль палова вучняў была вымушана пераздаць экзамен на атэстат аб сярэдняй адукацыі з-за скандалу з уцечкай у інтэрнэт экзаменацыйных заданняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*